# Грошы

## Урок грамадазнаўства, X клас

**Н. І. Тумаш, настаўніца гісторыі і грамадазнаўства**
**ДУА «ВВК "Вішнеўскі яслі-сад-сярэдняя школа"» Смаргонскага раёна**

**Мэты:** знаёмства вучняў з гісторыяй узнікнення і сутнасцю грошай; разгляд прычын і паказ сацыяльных і эканамічных вынікаў інфляцыі.

**Задачы**

1. Арганізаваць работу па засваенні вучнямі паняццяў *грошы, каштоўныя паперы, інфляцыя;* навучыць характарызаваць віды грошай і каштоўных папер, асноўныя функцыі грошай.
2. Развіваць камунікатыўныя ўменні і навыкі самастойнай працы, уменне выкарыстоўваць свой жыццёвы вопыт у рашэнні вучэбных задач.
3. Спрыяць фарміраванню эканамічнай культуры вучняў, выхаванню разумных адносін да грошай і іх выкарыстання.

**Тып урока:** урок засваення новых ведаў.

**Форма ўрока:** урок — дзелавая гульня.

**Асноўныя паняцці:** *грошы, сродак абароту, сродак плацяжу, сродак накаплення, мера кошту, сусветныя грошы, каштоўныя паперы* (акцыі, банкаўскія чэкі, вэксалі, аблігацыі), *інфляцыя, інфляцыя попыту, інфляцыя выдаткаў.*

**Абсталяванне:** камп'ютар, праектар, экран.

**Іншыя матэрыялы:** палітычная карта, раздатачны матэрыял (тэставыя і тэкставыя заданні,) нумізматычная калекцыя, набор рэчаў (соль, кава, чай, алей і інш.).

**Міжпрадметныя сувязі:** гісторыя, геаграфія, хімія.

**Формы работы:** групавая, франтальная, індывідуальная.

**План**

1. Сутнасць грошай і іх віды.
2. Асноўныя функцыі грошай.
3. Каштоўныя паперы.
4. Інфляцыя.

gisdapamoga.by

### Ход урока

***I. Арганізацыйны момант.*** **Тлумачэнне характару дзейнасці вучняў на ўроку і ацэньвання працы.**

***II. Актуалізацыя ведаў.*** **Эканамічная зарадка (па тэме папярэдняга ўрока «Роля эканомікі ў жыцці чалавека») (3 мін).**

Першы вучань дапаўняе схему:

**Прадукцыйныя сілы**

Прадукцыйныя сілы грамадства | Рабочая сіла | Сродкі вытворчасці

**Прадмет працы**

Сродкі працы

**Другі вучань чэрціць схему эканамічнага цыкла. Астатнія вучні выконваюць заданне «10 паняццяў» (неабходна злучыць 10 паняццяў з іх азначэннямі):**

**1. Сфера грамадскага жыцця, якая забяспечвае задавальненне патрэбнасцей людзей у жыццёвых дабротах. *(Эканоміка.)***

**2. Уздзеянне чалавека на прадметы і працэсы, у выніку якога ствараюцца патрэбныя яму жыццёвыя даброты. *(Вытворчасць.)***

**3. Усвядомленая мэтанакіраваная дзейнасць чалавека па вытворчасці матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей. *(Праца.)***

**4. Усё тое, на што накіравана праца чалавека. *(Прадмет працы.)***

5. Усе рэчы, з дапамогай якіх чалавек уздзейнічае на прадметы сваёй працы і відазмяняе іх. *(Сродкі працы.)*

6. Здольнасць чалавека да працы, сукупнасць фізічных і духоўных сіл чалавека, дзякуючы якім ён можа вырабляць жыццёвыя даброты. *(Рабочая сіла.)*

7. Прадукт працы, прызначаны для куплі-продажу. *(Тавар.)*

8. Стан патрэбы, недахопу чаго-небудзь, неабходнага для падтрымання жыццядзейнасці асобнага чалавека, сацыяльнай групы або грамадства ў цэлым. *(Патрэбнасць.)*

9. Сродкі, запасы, крыніцы чаго-небудзь. *(Рэсурсы.)*

10. Створаныя чалавекам рэсурсы, якія выкарыстоўваюць у вытворчасці. *(Капітал.)*

***III. Работа над новым матэрыялам.***

**Настаўнік.** Адгадайце загадкі: «Не каханне, а душу саграває», «Не здароўе, а без іх адчуваеш сябе няважна», «Не магніт, а прыцягваюць», «Не гаспадар, а падпарадкоўваюць», «Не слуга, а служаць». *(Грошы.)*

**Прэзентацыя «Грошы»**

Настаўнік звяртае ўвагу вучняў на экран, дзе запісана тэма ўрока (вучні запісваюць яе ў сшыткі), і прапаноўвае ім прадоўжыць сказ:

Па гэтай тэме мне вядома ... . Па гэтай тэме на ўроку я хачу даведацца ... .

— Наша задача — пашырыць і абагульніць вашы веды пра грошы (2 мін). З дзяцінства вы ведаеце, што грошы заўсёды патрэбныя і што іх часцей за ўсё не хапае. А ці задумваліся вы над тым, што такое грошы па сутнасці? Сапраўды, гэта дзіўна: чаму ў абмен на нейкую каляровую паперку мы можам атрымаць моднае адзенне, смачны торт ці любую іншую рэч? У чым тайная сіла грошай? Адкуль яны ўзяліся? Ці заўсёды былі? На гэтыя і іншыя пытанні мы і паспрабуем адказаць (5 мін).

— На маім стале знаходзяцца чай, кава, алей, соль, спецыі, кавалак тканіны. Гэтыя прадметы не выпадкова трапілі да нас. У розны час у розных народаў гэтыя рэчы выкарыстоўваліся ў якасці грошай, таму што большасць людзей брала іх як плату за свае тавары. Прапаную здзейсніць падарожжа ў гісторыю грошай.

**Вучань** *(агучвае апераджальнае заданне «З гісторыі грошай»).* Грошы існавалі не заўсёды. Вядома, што яны з'явіліся ў выніку неабходнасці абменьвацца вынікамі працы для задавальнення разнастайных патрэб людзей. Спачатку мянялі мяса на зерне, гаршчок на рыбу, авечку на адзенне. Пастунова стала зразумела, што гэта вельмі складана, таму што і тавараў, і спажыўцоў станавілася больш. Людзі вырашылі: намнога зручней пры абмене параўноўваць розныя тавары не адзін з другім, а з якімсьці эквівалентам. У некаторых плямёнаў грашамі былі жывёлы: каровы, коні, авечкі. У Індыі грашовай адзінкай з'яўляецца рупія, а гэта слова абазначала раней жывёлу. У Старажытным Рыме з наёмнымі воінамі разлічваліся торбачкамі з соллю, таму манеты, якія з'явіліся пазней, сталі называць «салінусы» (ад гэтага слова ўтварылася слова «салдат»). У розных народаў грашамі служылі сякеры, рыбалоўныя кручкі, незвычайныя ракавіны, мячы, наканечнікі стрэл, порах, зерне, рыба, кулі, рысавыя зярняткі і інш. А яшчэ феі! Не, гэта не казачны персанаж, а самая буйная дзіўная форма каменных грошай з вострава Яп у Ціхім акіяне. Феі — вялізныя каменныя кругі дыяметрам да трох з паловай метраў і вагой каля 5 тон, якія ляжалі перад домам уладальніка і сімвалізавалі дастатак. Але ўсе гэтыя грошы былі вельмі нязручныя, і людзі пачалі ўсё з большай ахвотай прымаць у абмен металы. Медзь і жалеза сталі замяняцца на золата і серабро. Спачатку людзі расплачваліся залатымі і сярэбранымі зліткамі, а пазней сталі чаканіць манеты. У Старажытным Рыме пры храме багіні Юноны (адно з яе імёнаў — Манета) была наладжана вытворчасць металічных манет. У Расіі чаканіць грошы сталі пры князі Уладзіміры ў канцы X ст. Зліткі серабра ў XIII ст. секлі на кавалкі, якія атрымалі назву рублі. У пачатку XVII ст. на Русі з'явілася капейка (на ёй быў адчаканены коннік з кап'ём). Цікавы факт: у 1748 г. М. В. Ламаносава ўзнагародзілі прэміяй — меднымі манетамі ў памеры 2000 рублёў, якія мелі вагу каля тоны. У Беларусі першыя звесткі пра ўласную чаканку манет адносяцца да канца XV ст. Першыя папяровыя грошы ўзніклі ў Кітаі ў VIII ст.

**Праблемнае пытанне:** чаму роля грошай замацавалася за высакароднымі металамі?

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

*Адказы: хімічная ўстойлівасць, мяккасць, коўкасць, высокі кошт.*

— Вызначце памылковае сцвярджэнне: у мінулым самай зручнай мерай кошту з'яўлялася золата: а) таму што яно лёгка дзеліцца на часткі; б) добра захоўваецца; в) маецца ва ўсіх краінах у дастатковай колькасці; г) мае вялікую каштоўнасць пры малых аб'ёмах.

Як вы думаеце, што ж такое грошы? *(Адказы, 2 мін.)*

> **Грошы** — усеагульны эквівалент, у якім выяўляецца і вымяраецца кошт усіх тавараў.
>
> **Грошы** — асаблівы тавар, які валодае здольнасцю абменьвацца на любы іншы тавар.
>
> **Грошы** — металічныя і папяровыя знакі, якія з'яўляюцца мерай кошту пры куплі-продажы, сродкам плацяжоў і прадметам накапленняў.
>
> **Грошы** — прызнаны ўсімі сродак абмену, які прымаецца ў абмен на тавары і паслугі, і можа быць выкарыстаны для накаплення багаццяў у будучым.

**Заданне.** Запішыце першае вызначэнне ў сшытак.

Клас падзяляецца на 3 групы, вучні сядзяць паўколам тварам да дошкі. Настаўнік тлумачыць умовы дзелавой гульні. Школьнікі выконваюць практыкаванне «Грошы згубіліся», працуюць з гістарычнай картай.

— Суаднясіце грашовыя знакі з назвамі краін, у якіх яны выкарыстоўваюцца (юань, літ, лат, злоты, фунт, грыўна, леў, рупія). На гэта вам даецца 1 мінута. А цяпер разгледзьце некалькі манет, банкнот, узятых са школьнага музейнага пакоя, а таксама пластыкавую картку. Выканайце практыкаванне. Якія з гэтых грошай можна аднесці да натуральных (паўнавартасных), сімвалічных і электронных? Складзіце схему «Віды грошай».

— Чаму разам з манетамі і банкнотамі ў мяне на стале ляжыць банкаўская картка? *(Адказы: хутка распаўсюджваецца ў сучасным свеце, амаль ідэальныя грошы, маленькія, лёгкія, гарантаваны ад крадзяжу, страты.)* З дапамогай пластыкавых картак можна безнаяўным шляхам расплаціцца за тавар, ажыццявіць плацяжы за камунальныя паслугі, папоўніць тэлефонны рахунак, атрымаць крэдыт, праводзіць аперацыі ў розных валютах.

— Што азначае тэрмін *функцыя грошай*? *(Адказы.)* Функцыя грошай — гэта вызначанае дзеянне ці «праца» грошай. Прачытайце пункт «Асноўныя функцыі грошай» і складзіце адпаведную схему. Якая функцыя грошай, на вашу думку, найбольш важная? *(Адказы.)*.

— Найбольш важная функцыя — сродак абароту. Любы тавар можна прадаць за грошы, і на атрыманую суму купіць іншы тавар. Маючы грошы, можам пераўтварыць іх у тавар: *Г—Т*, або можам прадаць штонебудзь, атрымаўшы за гэта грошы: *Т—Г*; яшчэ мы можам купіць тавар і адразу ж прадаць яго за большую цану, гэта значыць з прыбыткам: *Г — Т — Г*, або, наадварот, маючы ў лішку адну рэч, прадаём яе для таго, каб купіць другую, больш неабходную нам рэч: *Т — Г — Т*.

— Другой, не менш важнай, функцыяй з'яўляецца мера кошту. Кошт тавару, выражаны ў грашах, — цана. Трэцяя функцыя грошай — сродак плацяжу. Калі функцыя *сродак абароту* праяўляецца ў непасрэдным удзеле грошай у працэсе абмену, то *сродак плацяжу* — рух толькі грошай (аплата падаткаў, выплата заработнай платы) ці рух грошай, які не супадае з рухам тавару (пакупка тавару ў крэдыт). Функцыя *сродку ашчаджання і накаплення* — увасабленне багацця. Пры стабільнасці грошай іх можна накапляць. Сродак накаплення — функцыя грошай, жыццёва неабходная для рыначнай эканомікі.

— *Сусветныя грошы* — гэту функцыю грошы выконваюць у працэсе абслугоўвання эканамічных сувязей паміж краінамі. У іх ролі выступаюць зліткі каштоўных металаў (золата). Сёння ў якасці сусветных грошай шырока выкарыстоўваюцца валюты найбольш развітых краін. Прывядзіце прыклады. *(Адказы: долары ЗША, еўра, англійскія фунты, японскія іены.)*

Для паспяховага выканання сваіх функцый грошы валодаюць наступнымі ўласцівасцямі: ліквіднасцю, разменнасцю, зносастойкасцю і абароненасцю. Кожную з

гэтых уласцівасцей можна праілюстраваць займальнымі гісторыямі.

**Вучань 1. Ліквіднасць.** Расказваюць, што ў момант гібелі «Тытаніка» адзін з мільянераў прапаноўваў тысячы долараў за месца ў лодцы, але афіцэры, якія ратавалі дзяцей і жанчын, адмовілі яму. Грошы, якія яшчэ гадзіну назад рашалі ўсё, згубілі сваю ліквіднасць ва ўмовах катастрофы.

**Вучань 2. Разменнасць.** Расказваюць, што ў 50-х гг. у маскоўскіх трамваях ездзіў «сумленны заяц». Кожны раз ён працягваў тысячарублёвую купюру. Ніхто не мог даць яму рэшту. «Заяц» ездзіў, пакуль аднойчы кандуктары, згаварыўшыся, не сабралі сродкі і не размянялі яму банкноту.

**Вучань 3. Зносастойкасць.** Расказваюць пра «добрасумленнага» банкаўскага касіра, які працаваў з залатымі манетамі не на паліраваным стале, а на суконным абрусе. Кіраўніцтва банка некалькі гадоў захаплялася беражлівасцю касіра, пакуль не даведалася, як касір штодня ўціраў у тканіну залаты пыл з манет, атрымліваючы пры спальванні абруса грам золата. За 10 гадоў «добрасумленнай працы» касір прысвоіў 3 кг золата!

— Паглядзіце на макеты купюр і знайдзіце як мага больш ступеней абароны. Напрыклад, вадзяныя знакі, магнітная стужка, колер друку, індывідуальны нумар, мікрадрук, выпуклы друк, вуглавыя літары на стужцы, каляровыя валаскі на паперы, дэталі банкнотных малюнкаў, знакі для сляпых.

Вучні называюць функцыі грошай. Затым яны атрымліваюць картачкі з «Сітуацыямі». Неабходна вызначыць функцыю грошай у кожным выпадку і дапісаць яе.

Міша атрымаў у падарунак 500 000 рублёў і закапаў іх ля хаты пад бярозай. Неўзабаве ён даведаўся, што менавіта столькі ж каштуе тэлефон, які яму падабаецца. Міша адкапаў грошы, пайшоў у салон сувязі і купіў тэлефон...

Пенсіянерка Сідарава паклала у банк 1 000 000 рублёў пад працэнты...

Таня купіла на рынку сумачку за 200 000 рублёў. Зайшоўшы ў магазін, яна здзівілася, убачыўшы такую ж самую за 150 000 рублёў...

Іваноў атрымаў зарплату за мінулы месяц...

**Гульня «Эканамічнае лато»** (3 мін).

Гамбургер каштуе 4500 рублёў.

Вы абмянялі рублі на долары.

За бутылку пепсі-колы вы заплацілі 25 рублёў.

Муж хавае частку зарплаты ад жонкі.

Вы вяртаеце доўг свайму сябру.

У вас у кішэні 50 рублёў.

Брокер атрымаў камісійныя ад продажу каштоўных папер.

Грошы, схаваныя пад падушку.

Вы купляеце золата, каб зберагчы свае грошы ад абясцэньвання.

Вы паступілі ў інстытут, і вам выплачваюць стыпендыю.

Вы заплацілі за хлеб.

Кілаграм апельсінаў каштуе 15 000 рублёў.

Кілаграм памідораў на рынку ў аднаго прадаўца каштуе 20 000 рублёў, у другога — 25 000 рублёў.

Вы атрымалі заработную плату.

Вы заплацілі транспартны падатак.

Вы паклалі 1 000 000 рублёў у банк.

Вы адкладваеце 100 000 рублёў з кожнай зарплаты на пакупку веласіпеда.

Вы заплацілі за рамонт халадзільніка.

**Тэст** (1 мін)

Што не з'яўляецца функцыяй грошай у рынкавай эканоміцы:

а) сродак вымярэння;

б) сродак вытворчасці;

в) сродак плацяжу;

г) сродак захавання вартасці?

— Складзіце схему «Каштоўныя паперы» і дайце яе характарыстыку (3 мін).

*Электронныя грошы* знаходзяцца на рахунках камп'ютарнай памяці банка, распараджэнне якімі ажыццяўляецца з дапамогай банкамата.

*Пластыкавая карта* — пласцінка з пластычнага матэрыялу з нанесеным на яе магнітным кодам ці з кадзіруемым элементам памяці.



gisdapamoga.by

gisdapamoga.by

Настаўнік выцягвае з чорнай скрыначкі манеты, банкноты, латарэйныя білеты, аблігацыі, пластыкавую картку, а групы па чарзе называюць, што з прапанаванага належыць да грошай (натуральных, сімвалічных, электронных), а што — да каштоўных папер. Латарэйны білет — не грошы і не каштоўная папера.

— Становішча ў краіне, калі грошы робяцца ўсё больш таннымі і купіць за іх можна ўсё менш і менш тавараў, называецца інфляцыяй. Запішыце ў сшытку: «*Інфляцыя* — рост цэн на тавары і паслугі і абясцэньванне грошай».

З пункту гледжання прычын адрозніваюць *інфляцыю попыту* і *інфляцыю выдаткаў*. Інфляцыйны попыт — сітуацыя, калі ў наяўнасці вельмі шмат грошай, але малая колькасць тавараў. Інфляцыя выдаткаў — працэс павышэння цэн з-за павелічэння выдаткаў на вытворчасць прадукцыі. Трэба мець на ўвазе і іншыя фактары інфляцыі. Часам, напрыклад, недахоп асноўных тавараў у выніку ажыятажнага попыту можа прывесці да рэзкага павышэння цэн. Галоўным паказчыкам інфляцыі з'яўляецца яе тэмп. Па тэмпах інфляцыю падзяляюць на:

- *нулявую*, пры якой больш надзейна захоўваць грошы «ў панчосе»;
- *здаровую*, якая стымулюе ўклады насельніцтва: ТІ = 0 % —3 %;
- *інфляцыю*, якая вядзе да доўгатэрміновага існавання насельніцтва ва ўмовах зніжэння ўзроўню жыцця: ТІ = ад 4 %;
- *гіперінфляцыю*. Гэта інфляцыя з высокімі тэмпамі росту агульнага ўзроўню цэн (звычайна больш за 50 % на месяц). Успомніце з курса сусветнай гісторыі самы яркі прыклад гіперінфляцыі. *(Адказы: інфляцыя ў Германіі пасля Першай сусветнай вайны. З'явілася паняцце ранішнія, дзённыя і вячэрнія цэны.)*

*Тэмп інфляцыі* — лічба, якая паказвае, на колькі працэнтаў у сярэднім змяніліся цэны. Напрыклад: калі яны выраслі ў 1,5 раза, тэмп інфляцыі склаў 50 %.

З а д а н н е. Вызначце тэмп інфляцыі, калі цэны ў краіне выраслі ў 2 разы (100 %). У колькі разоў павысіліся цэны, калі тэмп інфляцыі склаў 40 %? *(1,4.)*

Ці можа хто-небудзь выйграць у стане інфляцыі? Максім узяў у Сяргея ў доўг тысячу долараў тэрмінам на год. За гэты час цэны ўзраслі ў 5 разоў. Значыць, даўжнік верне толькі адну пятую пакупной здольнасці грошай, гэта значыць, 200 долараў. Хто выйграў у гэтай сітуацыі? Што ў час інфляцыі выгадна: даваць у доўг ці браць у доўг?

Падумайце, якія эканамічныя і сацыяльныя наступствы мае інфляцыя? *(Адказы.)* З вашых выказванняў можна зрабіць наступныя вывады:

1. Інфляцыя зніжае жыццёвы ўзровень у краіне, асабліва моцна яна б'е па людзях, якія маюць фіксаваную пенсію, зарплату, дапамогі і г. д. Прывядзём такі прыклад. Да «перабудовы» ў Беларусі можна было купіць легкавы аўтамабіль «Таўрыя» за 5500 рублёў. У 1997 г. адна булка хлеба каштавала столькі, у той час як да інфляцыі яе можна было купіць за 15 капеек.
2. Адбываецца пераразмеркаванне даходаў у грамадстве.
3. Зніжаецца агульная эфектыўнасць эканомікі.

— Якія спосабы пагашэння інфляцыі вы маглі б прапанаваць (рэгуляванне цэн і скарачэнне выдаткаў, у тым ліку дзяржаўных)? *(Адказы.)*

**Конкурс «Знайдзі пару»**

— На адных картках ёсць сцвярджэнні або пытанні, на іншых — адказы. Падбярыце пары так, каб на зададзенае пытанне быў падабраны правільны адказ. За правільна падабраную пару налічваюцца 2 балы (па адным — кожнаму ўдзельніку), таму што ў парах могуць быць прадстаўнікі розных каманд. Час конкурсу — 2—3 мінуты.

**Пытанні**

1. Іена — гэта грашовая адзінка краіны... *(Японія).*
2. Прамы тавараабмен без удзелу грошай. *(Бартар.)*

gisdapamoga.by

3. Агульная назва ардынскіх грошай на Русі. *(Тэнге.)*

4. Чалавек, які добра разбіраўся ў манетах усіх краін, ведаў прапорцыі абмену адной манеты на іншую. *(Мяняла.)*

5. Чалавек, які падрабляў манеты ці зніжаў змест у іх каштоўных металаў. *(Фальшываманетчык.)*

6. Назва грашовай адзінкі, у назву якой уваходзіць адзінка вагі. *(Фунт стэрлінгаў.)*

7. Першыя папяровыя грошы ў Расіі з'явіліся ... *(у час царавання Кацярыны II).*

8. Хто сказаў: «Пазыка грошай — грэх, які нельга адмаліць?». *(Фама Аквінскі.)*

9. Знакамітае сямейства ў сярэдневяковай Італіі ўвяло мецэнацкую дзейнасць для замольвання граху. *(Медычы.)*

10. Краіна, якая першай стала друкаваць папяровыя грошы. *(Кітай.)*

11. Як называецца калекцыяніраванне манет? *(Нумізматыка.)*

12. Абясцэньванне папяровых грошай, якое суправаждаецца ростам цэн на тавары. *(Інфляцыя.)*

**Абмеркаванне афарызмаў (на выбар)**

Нажыць шмат грошай — храбрасць; захаваць іх — мудрасць; а ўмела расходаваць іх — майстэрства.

**Б. Авербах**

Грошы для разумных людзей з'яўляюцца сродкам, для неразумных — мэтай.

**Барглі**

Грошы не маюць ніякай маралі.

**М. Ларні**

Пакланенне залатому цяльцу — характэрны культ сучаснага грамадства.

**Дж. Расел**

Багацце не ў самім валоданні багаццем, а ва ўменні мэтазгодна карыстацца ім.

**Сервантэс**

Не шануй грошы не больш, не менш, чым яны таго вартыя. Гэта добры слуга і дрэнны гаспадар.

**А. Дзюма-сын**

Калі не ў грашах шчасце, дык аддай іх суседу.

**Ж. Рэнар**

Скнара заўсёды бедны. Ведай мэту і мяжу жаданняў.

**Ф. Петрарка**

Чалавек багаты або бедны не сваёй маёмасцю, а сваім унутраным зместам.

**Г. Бігер**

Людзі кажуць: каці манету наперадзе, і кожны будзе рады табе.

**У. Шэкспір**

***IV. Рэфлексія.***

— А зараз мы правядзём «Гульню з капелюшамі». Лідар кожнай групы возьме капялюш вызначанага колеру і разам са сваёй групай прааналізуе ўрок.

Белы капялюш: інфармацыя, факты. Што вы даведаліся новага на ўроку, якая яшчэ інфармацыя вам неабходна?

Жоўты капялюш: «плюсы» ўрока. Навошта вам гэта інфармацыя?

Чорны капялюш: — «мінусы» ўрока.

Чырвоны капялюш: эмоцыі. Што вы адчувалі? Ці было вам камфортна на ўроку?

Сам настаўнік «прымярае» сіні капялюш як сімвал роздуму. Падводзіць вынік работы на ўроку.

— Чалавецтва заўсёды надавала вялікае значэнне тэме грошай. Вы, напэўна, пагадзіцеся, што розныя людзі адносяцца да іх неаднолькава. Для некага — гэта сэнс жыцця, для іншага — сродак задавальнення надзённых патрабаванняў. Старажытнагрэчаскі паэт Сафокл сцвярджаў, што грошы змяняюць людзей, робяць іх скупымі.

Але не трэба перабольшваць ролю грошай, ператвараць іх у адзіную мэту ў жыцці. Неабходна памятаць, што не самі грошы прыносяць шчасце, а адносіны чалавека да іх. Культура зносін з грашыма — гэта частка агульнай культуры чалавека.

Настаўнік ацэньвае работу кожнай групы.

***V. Дамашняе заданне.*** 1. Сачыненне-мініяцюра «Не ў грашах шчасце?». 2. Апераджальнае заданне: назавіце асноўныя віды даходаў вашай сям'і (1 мін).

gisdapamoga.by
gisdapamoga.by

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Грамадазнаўства: вучэб. дапам. для 10-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / М. І. Вішнеўскі [і інш.]. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. — 240 с.: іл.
2. *Губарев, Н. И.* Деньги: экономический и социальный аспекты / Н. И. Губарев // Чалавек. Грамадства. Свет. — 2001. — № 1.
3. Детская познавательная энциклопедия / сост. Г. П. Яковенко. — К.: Сканнер, 1993. — 376 с.
4. Обществоведение в 10 кл.: учеб.-метод. пособие для учителей / В. Н. Гирина [и др.]. — Минск: Нар. асвета, 2012.

# Вы зависимы от хрустящих купюр?

**Н. И. Тумаш**

**Учитель.** Довольно часто мы сетуем на то, что нам явно не хватает денег. И данное обстоятельство существенно портит нам жизнь.

**1. Вы в одночасье стали миллионером. Как распорядитесь деньгами:**

а) будете копить дальше — 3; б) будете проводить свободное время в своё удовольствие — 2; в) даже трудно представить себе такую кучу денег — 1?

**2. Какое высказывание вам ближе:**

а) деньги — это бумажки — 1; б) не имей сто рублей, а имей сто друзей — 2; в) деньги решают всё — 3?

**3. В какой газетной рубрике вам хотелось бы увидеть свою фамилию:**

а) развлечения, отдых, спорт — 2; б) финансовые вести — 3; в) в любой, лишь бы не в некрологе — 1?

**4. Какой из курсов вас больше волнует:**

а) курс лайнера, на котором собираюсь в отпуск, — 2; б) курс доллара — 3; в) курс университета, за который смогу оплатить учёбу моего чада, — 1?

**5. Знакомые никак не могут вернуть вам долг. Что вы думаете о них:**

а) крайне непорядочные люди. Нужно было истребовать с них что-нибудь в залог — 3; б) эх, плакали мои денежки — 1; в) наверное, у них какие-то трудности. Ничего, ещё подожду — 2?

**13—15 баллов.** Похоже, ваше кредо — жить ради денег. Солидный капитал — вещь хорошая, но вы можете, будучи богатым, всё равно остаться бедняком. Вокруг много интересного, и если жизнь пройдёт мимо, грош цена вашим миллионам. **8—12 баллов.** А вот у вас, наоборот, деньги — для жизни. Вы и зарабатывать умеете, и с умом тратить. Желаем успехов, только не потратьте всё сразу. **5—7 баллов.** Складывается впечатление, что вы независимы от денег. Может, потому, что у вас не всегда их много? Не огорчайтесь: всего не купишь, а при желании и с небольшой суммой можно почувствовать себя богачом.

***Умеете ли вы зарабатывать деньги? Богатым быть, конечно, хорошо, только вот богатство к одним само плывёт в руки, а от других убегает прочь. Может, в этом вы сами виноваты?***

**1. Как бы вы повели себя, попав с друзьями в казино:**

а) наблюдал бы за игрой — 1; б) сделал бы пару ставок — 3; в) рисковал бы по-крупному — 0?

**2. Каким способом вы бы предпочли разбогатеть:**

а) найти клад — 0; б) удачно жениться — 1; в) честно заработать — 3?

**3. У вас есть деньги. Как распорядитесь ими:**

а) вложу в дело — 3; б) потрачу с удовольствием — 0; в) положу в банк — 1?

**4. В каком качестве вы бы согласились бы работать в крупной компании:**

а) распространителем продукции — 0; б) президентом — 3; в) не знаю — 1?

**5. По какому бы принципу вы набирали людей в фирму:**

а) по деловым качествам — 3; б) взял бы родных и друзей — 0; в) доверился бы интуиции — 1?